***Л. Д. Сінькова,***
*доктар філалагічных навук, прафесар*

# АКТУАЛЬНАСЦЬ ВЫВУЧЭННЯ СЛАВЯНСКІХ ЛІТАРАТУР У ВНУ БЕЛАРУСІ
## З нагоды выхаду ў свет вучэбнага дапаможніка Н. А. Булацкай «Славянские литературы: классика и современность»

Славістыка ў Беларусі развіваецца актыўна і плённа. Айчынныя вучоныя праз кожныя пяць гадоў удзельнічаюць у міжнародных з’ездах славістаў, якія праводзяцца ў розных краінах свету: Беларусь, гэтаксама як Украіна, уваходзіць у склад Міжнароднага камітэта славістаў (МКС) з часоў яго заснавання ў 1955 г. У нашай краіне рэгулярна выдаюцца манаграфічныя і калектыўныя працы ў названай галіне. Запатрабаваным застаецца плён А. Лойкі, І. Шаблоўскай, А. Мальдзіса, І. Чароты, Е. Лявонавай, С. Мусіенкі, Т. Кабржыцкай, В. Рагойшы, У. Рагойшы, У. Кароткага, У. Мархеля, Г. Тычка, Г. Тварановіч, Г. Адамовіч, А. Вострыкавай, Н. Рашэтнікавай, П. Навойчыка, М. Хаўстовіча, М. Хмяльніцкага, а таксама Х. Янашак-Іванічкавай (Варшава), А. Баршчэўскага (Варшава), Я. Чыквіна (Беласток), Л. Глагоўскай (Беласток), Б. Сівэк (Люблін), Г. Аўэрсвальда (Йена), Г.-Б. Колера (Ольдэнбург), М. Кандлін (Ольдэнбург), А. Макміліна (Лондан), многіх іншых славістаў-літаратуразнаўцаў. У апошнія дзесяцігоддзі з’явіліся і чарговыя грунтоўныя выданні з грыфам беларускай Акадэміі навук: чатырохтомнае даследаванне «Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей» (1993–1995) і «Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей: культурна-гістарычны і літаратуразнаўчы аспекты праблемы» (2002).

Такім чынам, вывучэнне літаратур славянскіх народаў традыцыйна з’яўляецца адным з прыярытэтаў беларускай навукі. У сучасным свеце актуальнасць такіх даследаванняў абвастрылася яшчэ і ў сувязі з тым, што ў 1980-я і пазнейшыя гады змяніўся статус шэрагу славянскіх краін, з’явіліся новыя рэаліі ва ўсёй еўрапейскай культуры, і гэта адлюстравалася ў літаратуры. Адпаведна ўзрасла актуальнасць вывучэння і выкладання славянскіх літаратур у іх гістарычным развіцці.

У беларускай сістэме вышэйшай адукацыі славістыка мае сваё значнае месца: найперш на філалагічных факультэтах і ў тых ВНУ,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзе студэнты атрымліваюць гуманітарную адукацыю. Гэтыя ўстановы істотна адрозніваюцца сваімі магчымасцямі; напрыклад, у БДУ ёсць кафедра славянскіх літаратур і кафедра тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, у ГрДУ імя Я. Купалы – асобная кафедра польскай філалогіі, у БДУКМ, як і ў большасці ВНУ, розныя нацыянальныя літаратуры выкладаюцца ў інтэграваных курсах.

Аднак перад студэнтамі ўсіх ВНУ стаяць аналагічныя задачы. Відавочна, што малады чалавек з вышэйшай адукацыяй павінен па магчымасці добра арыентавацца ў культурах сучаснага свету (найперш – блізкага славянскага свету), дзе надзвычай скараціліся адлегласці, пашырыліся інфармацыйныя плыні, бурліва развіваецца міжкультурная камунікацыя, растуць патрабаванні да асобы. У такіх умовах патрабуецца і адпаведнае забеспячэнне вучэбнага працэсу грунтоўнымі навукова-метадычнымі распрацоўкамі.

У 2011 г. на базе БДУКМ выйшла ў свет новае актуальнае выданне – вучэбна-метадычны дапаможнік прафесара Н. А. Булацкай «Славянские литературы: классика и современность». Кніга адрасаваная студэнтам найперш БДУКМ, а таксама навучэнцам усіх ВНУ нефілалагічнага профілю і ўсім, хто мае патрэбу ў знаёмстве з гісторыяй і сучасным станам балгарскай, польскай, сербскай, чэшскай літаратур.

Агульная канцэпцыя дапаможніка мае на ўвазе рэпрэзентатыўнасць прапанаванага матэрыялу, дакладнасць ацэнак, лаканізм і яскравасць дэталей у падачы пісьменніцкіх біяграфій і мастацкіх тэкстаў. У прадмове «От автора» Н. А. Булацкая зазначае: «За короткое время студенту нужно найти и осмыслить большой объем информации. Многие умело используют возможности компьютера, Интернета, однако не всегда знают, что именно искать, в каком направлении осуществлять поиск, и в этом отношении подготовленное пособие – помощь в отборе информации, своеобразный путеводитель по миру славянской литературы» [1, с. 5].

Працытаваныя словы падкрэсліваюць адрозненне новага дапаможніка ад іншых падобных прац. Звычайна ў выданнях такога плану разглядаецца адна славянская літаратура [2; 5; 6] або канцэптуальнай звязкай робіцца якая-небудзь спецыяльная навуковая праблема (у дапаможніках для філолагаў) [3]. Звыклыя для нас і падручнікі (для філолагаў) па замежных літаратурах, з дамінаваннем, як правіла, неславянскай тэматыкі, у якія ўключаюцца асобныя славістычныя раздзелы [4, с. 210–232]. Аднак

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інтэгральныя курсы па літаратуразнаўчых дысцыплінах дыктуюць вучоным свае ўмовы, важнейшыя з якіх – дакладная адрасацыя, улік аб’ектыўных магчымасцей навучэнцаў. У гэтым плане навуковы дапаможнік, прапанаваны прафесарам Н. А. Булацкай, варта разглядаць як перадумову з’яўлення падручніка па славянскіх літаратурах, пакуль што яшчэ не створанага айчыннымі славістамі для студэнтаў гуманітарных ВНУ нефілалагічнага профілю.

Важна, што ў кнізе «Славянские литературы: классика и современность» пададзены самыя значныя з’явы ў гісторыі балгарскай, польскай, чэшскай, сербскай літаратур з часоў старажытных да сучаснасці. Яны разглядаюцца ў агульным эстэтычным кантэксце вялікіх стыляў, кірункаў і школ, з акцэнтам на філасофскіх і культурна-гістарычных асновах мастацкай творчасці, з пазначэннем некаторых сувязей з беларускай літаратурай. Аптымальны і прынцып падачы матэрыялаў: у дапаможніку, акрамя асноўных раздзелаў, змешчаны бібліяграфічныя спісы, мініхрэстаматыя, пытанні для самакантролю.

Усё адзначанае спрыяе эфектыўнасці вучэбнага працэсу, фарміраванню міжкультурнай кампетэнцыі выпускнікоў беларускіх ВНУ ў розных галінах прафесійнай дзейнасці. Разам з гэтым праз адукацыйныя задачы славістыка вядзе навучэнцаў да разумення складанасцей сучаснага свету, у якім славяне цягам многіх стагоддзяў захоўваюць сваю ідэнтычнасць – насуперак дэструктыўным павевам часу ў адносінах да традыцыйных нацыянальных каштоўнасцей.

1. *Булацкая, Н. А.* Славянские литературы : классика и современность (болгарская, польская, сербская, чешская) : учеб.-метод. пособие / Н. А. Булацкая. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011. – 143 с.

2. *Вострыкава, А. У.* Чэшская літаратура другой паловы XX стагоддзя : вучэб.-метад. дапаможнік / А. У. Вострыкава. – Мінск : БДУ, 2010. – 108 с.

3. *Кабржыцкая, Т. В.* Фальклор і літаратура : феномен беларуска-польска-ўкраінскага культурнага памежжа / Т. В. Кабржыцкая, М. М. Хмяльніцкі, Э. Ю. Дзюкава ; пад рэд. Т. В. Кабржыцкай. – Мінск : Кнігазбор, 2011. – 184 с.

4. *Леонова, Е. А.* Польская литература // История зарубежной литературы второй половины XIX – начала XX века : учеб. пособие / Т. В. Ковалева, Т. Д. Кириллова, Е. А. Леонова. – Минск : Завигар, 1997. – 336 с.

5. *Хмяльніцкі, М. М.* Польская драматургія XX стагоддзя : вучэб. дапаможнік / М. М. Хмяльніцкі. – Мінск : БДУ, 2008. – 79 с.

6. *Чарота, І. А.* Гісторыя сербскай літаратуры : практыкум / І. А. Чарота. – Мінск : БДУ, 2006. – 85 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ